# *ДА 80-ГОДДЗЯ*
# *МІКАЛАЯ ІВАНАВІЧА ЧАРГІНЦА*



*Дарагі Мікалай Іванавіч!*

*Калектыў Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі сардэчна віншуе Вас з 80-годдзем! За плячыма велізарнае жыццё. Яно, як цікавая, шыкоўна выдадзеная кніга – у цвёрдай вокладцы, з мноствам старонак. Адны з гэтых старонак запоўненыя душэўным болем, іншыя – плённай працай. Далёка за межамі вядомы Вашы творы і заслугі перад радзімай. Але не пасады і ўзнагароды робяць жыццё творчага чалавека па-сапраўднаму шчаслівым і паўнавартасным, а згода з самім сабой і навакольным светам. Мы, Вашы калегі і падначаленыя, як і належыць сапраўдным сябрам, гатовы і надалей падзяляць з Вамі радасць перамог, а боль Вашага сэрца будзе заўсёды адгукацца рэхам і ў нашых сэрцах. Таму, разам з пажаданнямі далейшых творчых поспехаў, прыміце шчырыя пажаданні моцнага здароўя, натхнення, добрых навін, паболей штодзённай радасці, дабрабыту, а побач – як мага больш сапраўдных сяброў і спрыяльных шчырых людзей. Няхай абмінаюць Вас нягоды, а жыццё ў мастацтве і Муза натхнення падараць яшчэ шмат захапляльных літаратурных сюжэтаў. Жывіце і твbooрыце на радасць чытачам. З ЮБІЛЕЕМ!*

***17 кастрычніка 2017 года*** ***Гродна-Мінск***

